

Якую ролю можа адыграць Таджыкістан у выхадзе беларускай прадукцыі на цэнтральнаазіяцкі рэгіён і калі адбудзецца візіт прэзідэнта Эмамалі Рахмона ў Беларусь?

СТАР. 4



Яна праводзіць свой першы сезон у «дарослым» спорце і адразу ўварвалася ў яго эліту. Гэта Аліна Талай — уладальніца «бронзы» на чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы ў бегу на 60 м з бар'ерамі.

СТАР. 6



Тэмпература цела матылька — 14 градусаў, таму дотык рукі чалавека для іх раўназначны апёку. Упершыню ў Беларусі праходзіць выстава жывых экзатычных матылькоў.

СТАР. 8


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 САКАВІКА 2012 г. АЎТОРАК № 52 (27167) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЗЯЎ УДЗЕЛ У ПАСЯДЖЭННІ МІЖДЗЯРЖСАВЕТА ЕЎРАЗЭС У МАСКВЕ

**У Маскве адбылося пасяджэнне Міждзяржаўнага савета Еўразійскага эканамічнага супольніцтва/Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Удзел у ім узялі кіраўнікі дзяржаў — членаў ЕўрАзЭС (Расія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан), а таксама лідары дзяржаў-назіральніц пры супольніцтве (Арменія, Малдова, Украіна), перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнты абмеркавалі далейшае ўзаемадзеянне дзяржаў інтэграцыйнага аб'яднання ва ўмовах стварэння і развіцця Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана.

На пасяджэнні разглядаліся пытанні ўдакладнення контураў будучых рэгіянальных інтэграцыйных працэсаў. Такім чынам, сустрэча мае вялікае значэнне для далейшага ходу еўразійскай эканамічнай інтэграцыі.

Як паведамлялася, ЕўрАзЭС плануецца пераўтварыць у новае інтэграцыйнае аб'яднанне. Рашэнне па базавых прынцыпах праекта адпаведнага дагавора можа быць прынята на гэтай сустрэчы.

Акрамя гэтай галоўнай тэмы на пасяджэнні разглядаліся пытанні пачатку работы Еўразійскай эканамічнай камісіі. Сярод іншых важных аспектаў далейшай інтэграцыі — уніфікацыя пашпартна-візавага кантролю ў дзяржавах — членах Мытнага саюза, нацэленая на забеспячэнне свабоднага і беспярашкоднага перамяшчэння грамадзян па тэрыторыі трох краін.

Учора, адкрываючы пасяджэнне, Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў пацвердзіў, што асноўны пункт парадку дня датычыцца выканання дамоўленасцяў папярэдняга саміту ЕўрАзЭС, які прайшоў у Маскве 19 снежня 2011 года, аб рэарганізацыі супольніцтва. «Мы абмяркоўвалі гэту тэму. Тады нават прагучалі прапановы неадкладна ліквідаваць ЕўрАзЭС, але пасля, параіўшыся, мы вырашылі, што гэты працэс павінен мець цывілізаваны характар і праходзіць у пэўных прававых рамках», — сказаў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Адзначыючы прысутнасць на пасяджэнні лідараў дзяржаў-назіральніц пры супольніцтве (Арменія, Малдова, Украіна), Дзмітрый Мядзведзеў выказаў меркаванне, што мерапрыемства пройдзе ў паўнацэнным фармаце.

## ПЕНСІЯНЕРЫ Ў БЕЛАРУСІ ЗМОГУЦЬ ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПАМЕР ПЕНСІІ ПРЫ БОЛЬШ ПОЗНІМ ВЫХАДЗЕ НА ЯЕ

**Адпаведны ўказ № 136 «Аб мерах па ўдасканаленні пенсійнага забеспячэння грамадзян» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 18 сакавіка.**

Дакументам прадугледжана, што пры прадаўжэнні работы без атрымання дзяржаўнай пенсіі па ўзросце пасля набыцця права на яе памер пенсіі прагрэсіўна павялічваецца:

за першы год — на 6 працэнтаў заробку, які прымаецца для вылічэння пенсіі;

за два гады памер павышэння складзе 14 працэнтаў (павышэнне на 8 працэнтаў за другі год работы падсумоўваецца з павышэннем на 6 працэнтаў за першы год);

за тры гады — 24 працэнты (14 працэнтаў за два гады плюс 10 працэнтаў за трэці год);

за чатыры гады — 36 працэнтаў (24 працэнты за тры гады плюс 12 працэнтаў за чацвёрты);

за пяты і кожны наступны год прадугледжваецца павышэнне памеру пенсіі на 14 працэнтаў заробку, якія таксама падсумоўваецца з працэнтамі павышэння, устаноўленымі за папярэдні перыяд (за 5 гадоў — 50 працэнтаў, за 6 гадоў — 64 працэнты).

СТАР. 2

## РАЗВІТАЛЬНЫ СНЕГ ПАД ВЕТРАЗЕМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І хоць апошні снег не заўсёды добры для спорт-кайтынгу, аматары катання на лыжах альбо сноўбордзе з дапамогай паветранага змея актыўна імкнуцца ў гэтыя дні на палеткі з белым покрывам, каб пасваволіць і адвесці душу ад імгненнага разгону і высокіх хуткасцяў. Гэткіх лыжнікаў і сноўбардыстаў можна зразумець: наступны снег будзе ў лепшым выпадку толькі праз дзевяць месяцаў.

Для Уладзіміра Гаўрылёнкі (на фотаздымку) гэта быў дзясяты зімовы паветрана-лыжны сезон. Хапіла яму і снегу, і моцнага ветру. Ён аматар, але дасканала авалодаў тэхнікай кіравання паветраным змеем і зараз дапамагае навічкам засвоіць азы спорт-кайтынгу.

■ На скрыжаванні думак

## РАМАНТЫКА І РЭАЛІІ «НОВАГА СВЕТУ»

### Як захаваць самабытнасць раёна гістарычнай забудовы ў Гродне?

**На сучасных картах Гродна няма мікрараёна «Новы свет», але менавіта такую гістарычную назву мае квартал паміж цяперашнімі вуліцамі Горкага і Ажэшкі. Напрыклад, у экспазіцыі Дома-музея Максіма Багдановіча ёсць канверт з адрасам «гор. Гродна, Новы свет, дом Агульнікава», які (з нотамі для фартэпіяна) атрымала з Пецярбурга маці паэта. З Новым светам звязвае месца жыхарства сваёй сям'і і Адам Ягоравіч Багдановіч: «Жылі мы на ўскраіне горада, на Новым свеце па Садовай ...». Першыя пабудовы з'явіліся там у 1770-х гадах пры гарадзенскім старасце Антонію Тызенгаўзу, а найбольш актыўна квартал пачаў развівацца напрыканцы XIX стагоддзя. У 1920-30-х гадах тут будавалі драўляныя і мураваныя дамы ў стылі канструктывізму, які меў на ўвазе стварэнне зручнага і камфортнага жылля. А жыхарамі ў асноўным былі інжынеры, настаўнікі, чыноўнікі, урачы, вайскоўцы.**

На колішняй ускраіне, як пісаў Адам Багдановіч, а цяпер літаральна за два крокі ад гістарычнага цэнтра горада над Нёманам ужо не першы год сутыкаюцца розныя погляды на будучыню гэтага квартала. Асабліва калі нейкі аб'ект спыняе сваё існаванне (будынак, дзе размяшчалася крама «Гарачы хлеб») альбо з'яўляюцца чуткі аб планах зносу іншых дамоў. Некаторыя гісторыкі і краязнаўцы настойваюць на захаванні рыс адзінага гісторыка-культурнага ансамбля «Новы свет», лічаць неабходным выкарыстаць дзеля гістарычнай адукацыі і турызму «тэму» знакамітых людзей, якія там пражывалі. Але мясцовая ўлада вымушана таксама рэагаваць і на звароты тутэйшых жыхароў, у якіх — не гонар за архітэктурную адметнасць гэтага квартала, а горыч, што ў XXI стагоддзі яны вымушаны жыць без ванны і з прыбіральняй на двары.

Такім чынам, з аднаго боку, так бы мовіць, рамантыка гістарычнай спадчыны, а з іншага — зусім не рамантычныя рэаліі жыцця канкрэтных людзей. Ці магчымы тут кампраміс? Як адаптаваць рысы мінулага да сучаснай горадабудаўнічай тканіны? Каб выпрацаваць падыходы да вырашэння пытання, **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА, яго намеснікі Уладзімір ДЗЯШКО і Ігар ЖУК, мэр абласнога цэнтра Барыс КАЗЯЛКОЎ** разам з гісторыкамі, краязнаўцамі і журналістамі ў адну з субот накіраваліся на прагулку па «Новым свеце».



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Наша падарожжа (гід — **дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат гістарычных навук Андрэй ЧАРНЯКЕВІЧ**, аўтар кнігі «Новы свет і яго наваколле») пачынаецца на вуліцы Горкага, дзе размешчаны комплекс будынкаў 1895—1912 гадоў. Ахоўная дошка знаёміць з іх аўтарамі (архітэктар М. Плотнікаў, інжынер Л. Сямёнаў), звяртае ўвагу на статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і папярэджвае, што «прычыненне шкоды караецца ў адпаведнасці з законам». Раней у гэтых будынках размяшчаліся памежнікі, аднак цяпер сродкі абласнога бюджэту накіроўваюцца на тое, каб яны працавалі ў больш зручных, сучасных умовах. А што рабіць з ранейшым месцам дыслакацыі памежнага атрада — вялікае пытанне.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЯКАБСОН, Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі:**

***«Не выключана, што грамадзянам, якія заключылі дагаворы на жыллёвае будаўніцтва з дзяржпадтрымкай, але страцілі гэтае права ў сувязі з уступленнем у сілу Указа № 13, будуць прадастаўлены пэўныя прэферэнцыі. Зараз урад выпрацоўвае сістэму мер па вырашэнні праблем грамадзян, якія будавалі жыллё па льготных крэдытах, рыхтуецца рашэнне аб тым, каб па раней заключаных дагаворах былі рэалізаваны ўсе тыя ўмовы, на якіх яны былі заключаны. У пачатку красавіка кіраўніку дзяржавы будзе прадстаўлена на разгляд канцэпцыя жыллёвага будаўніцтва Рэспублікі Беларусь».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.03.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8000,00 | ▼ |
| Еўра | 10530,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 274,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 995,95 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 10° |
| Віцебск | + 4° |
| Гомель | + 9° |
| Гродна | + 5° |
| Магілёў | + 5° |
| Мінск | + 5° |

### Наркотыкі ў «БМВ»

Ноччу ў Віцебску на Маскоўскім праспекце спынілі аўтамабіль «БМВ—525», якім кіраваў 32-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі, які мае від на жыхарства ў нашай краіне. Падчас агляду аўтамашыны супрацоўнікамі міліцыі быў знойдзены поліэтыленавы пакет, у якім знаходзілася 98,66 грама гераіну.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


БЕЛИНВЕСТБАНК
www.belinvestbank.by

ИНФОРМИРУЕТ

Наблюдательным советом ОАО «Белинвестбанк» принято решение о закрытии региональных филиалов и о создании на их базе структурных подразделений банка, не имеющих самостоятельного баланса и отдельного банковского идентификационного кода.

С 21 апреля 2012 года на базе Головного филиала по Брестской области ОАО «Белинвестбанк» создается структурное подразделение ОАО «Белинвестбанк» – Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области.

Всем клиентам Головного филиала по Брестской области ОАО «Белинвестбанк» сообщаем о том, что наше сотрудничество будет продолжаться на условиях ранее заключенных договоров.

Телефоны для справок – **8 (0162) 27 42 27, 23 08 36.**

Телефон контакт-центра – **146.**

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028. Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 27.10.2006.


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ГЕРМАНІІ ПАЧАЛАСЯ НОВАЯ ХВАЛЯ ЗАБАСТОВАК ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫХ

Нямецкія прафсаюзы аб'явілі аб новай хвалі страйкаў дзяржслужачых. Патрабаваннем страйкоўцаў з'яўляецца павышэнне зарплаты на 6,5 працэнта, але не менш чым на 200 еўра, тады як прадстаўнікі працадаўцаў згодны толькі на 3,3 працэнта. Першы этап забастовак прайшоў у пачатку сакавіка. У панядзелак, 19 сакавіка, забастоўкі пачаліся ў Ніжняй Саксоніі і Брэмене. Там адмовіліся выходзіць на працу супрацоўнікі дзіцячых садкоў, вадзіцелі аўтобусаў і прыбіральшчыкі смецця. Пасля першай хвалі страйкаў прафсаюзы і працадаўцы пачалі перамовы, аднак яны праваліліся. Новы этап перамоў прызначаны на 28-29 сакавіка.

### РЭЙТЫНГ РЭКАРДСМЕНАЎ ПА ЗАКУПКАХ ЗБРОІ

Пяццю найбуйнейшымі імпарцёрамі зброі ў свеце ў мінулым годзе сталі краіны Азіі, сведчыць справаздача Стакгольмскага інстытута даследавання праблем міру (SIPRI). У ім таксама гаворыцца, што Сірыя ўзбройваецца амаль у шэсць разоў больш актыўна, чым раней. Паводле звестак справаздачы, у параўнанні з 2002-2006 гадамі агульны аб'ём здзелак за перыяд з 2007 па 2011 год вырас на 24%. Пры гэтым на краіны Азіі і Акіяніі прыйшлося 44% сусветнага імпарту зброі. Самым буйным сусветным імпарцёрам узбраенняў зноў стала Індыя, доля якой у агульным аб'ёме склала 10%. За ёй ідуць Паўднёвая Карэя (6%), Пакістан і Кітай (па 5%), Сінгапур (4%).

### ПРЭЗІДЭНТАМ АБРАЛІ ПРАВААБАРОНЦУ З ГДР

Прэзідэнтам Германіі абралі праваабаронцу з ГДР і былога лютэранскага пастара Ёахіма Гаўка. 72-гадовы Гаўк атрымаў падтрымку 991 з 1232 членаў Федэральнага сходу, у які ўваходзяць дэпутаты бундэстага і прадстаўнікі федэральных зямель. Яго кандыдатуру вылучылі адразу некалькі партый, у тым ліку кіруючая кааліцыя і «Зялёныя». Датэрміновыя выбары прэзідэнта Германіі былі прызначаны пасля таго, як у лютым 2012 Крысціян Вульф вымушаны быў пакінуць гэтую пасаду з-за абвінавачванняў у карупцыі.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЛІТВА МОЖА СТРАЦІЦЬ МІЛЬЯРДЫ

Літоўскія бізнэсмены папярэджваюць, што Літва, падтрымаўшы санкцыі ў дачыненні да Беларусі, можа панесці мільярдныя страты, паведамляюць інфармагенцтвы.



Прэзідэнт Літоўскай асацыяцыі кампаній, якія займаюцца марскімі перавозкамі, Алаізас Кузмарскіс упэўнены, што ўрад выдатна разумее, што Літва ад іншых краін Еўропы адрозніваецца тым, што праз гэтую краіну ідуць транзіт, экспарт і імпарт на Усход менавіта праз тэрыторыю Беларусі. А дыскусіі аб Беларусі ў Брусэлі пагражаюць літоўскаму транзіту і ўсёй эканоміцы Літвы.

«Мы павінны рэальна ацэньваць жыццё, бо Літва і Беларусь — гэта не проста блізкія суседзі, якіх аб'ядноўвае 1000 км агульнай мяжы, але і порт, чыгунка, эканамічныя адносіны... Таму наша стаўленне да яе павінна адрознівацца ад меркавання Мальты ці Партугаліі, у якіх з Беларуссю мала што агульнага». Бізнэсмены прасілі, каб міністр замежных спраў Аўдроніс Ажубаліс, які будзе прадстаўляць краіну на з'ездзе міністраў замежных спраў, асцярожна фармуляваў пазіцыю Літвы па гэтым пытанні.

КОРАТКА

Юань можа стаць рэзервовай валютай Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) пры ўмове, што Кітай знізіць залежнасць эканомікі ад экспарту і інвестыцый і правядзе эканамічныя рэформы. З такой заявай у Пекіне выступіла кіраўнік арганізацыі Крысцін Лагард, паведамляюць інфармагенцтвы.

У Беларусі ў лютым 2012 года ў параўнанні са студзенем знізіліся цэны на крупы, алей, макарону, мяса птушкі, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Цэны на прасяныя крупы знізіліся на 5,5 працэнта, грэцкія крупы — на 2,6 працэнта, алей — на 1,9 працэнта, мяса птушкі — на 0,7 працэнта. У той жа час найбольш высокі рост цэн у лютым адзначаны на агародніну і бульбу — адпаведна 109,4 працэнта і 106,1 працэнта да студзеня. Свежыя агуркі падаражэлі на 15,6 працэнта, салодкі перац — на 14,7 працэнта. Цэны на бананы выраслі на 12,7 працэнта. У лютым таксама павялічыліся цэны на піва на 7,5 працэнта, бескасцёвую ялавічыну — на 5,4 працэнта, соль — на 4,9 працэнта.

19 сакавіка курс нацыянальнай валюты адносна долара дасягнуў псіхалагічна важнай адзнакі Br8 000. Адносна еўра беларускі рубель спыніўся на пазіцыі Br10 530 за 1 еўра, на расійскі рубель курс устаноўлены ў Br274.

## ЧАМУ ВЫ АДДАЯЦЕ ПЕРАВАГУ — ЧЫТАННЮ КНІГ ЦІ ІНТЭРНЭТУ?



**Анатоль Казлоў, рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць», пісьменнік:**

— Як на маю думку, то інтэрнэт — не перашкода чытанню. Сусветная павуціна можа толькі дапамагчы ў выбары твора, ягонай знаходцы, калі пэўная кніга не паступіла яшчэ ў продаж.

Па родзе сваёй дзейнасці і працы мне штодня даводзіцца чытаць рукапісы як аўтараў-пачаткоўцаў, так і добра вядомых не толькі ў Беларусі, але і за межамі краіны. Адсюль вынікае, што чытанне — мой асноўны і нязменны занятак на працягу ўсяго жыцця. Але, каб добра арыентавацца не толькі ў айчыннай літаратуры, але і ў еўрапейскай ды сусветнай, шмат даводзіцца чытаць кніг аўтараў з розных кантынентаў. Без гэтага ведання проста немагчыма прасачыць шляхі і напрамкі развіцця роднай літаратуры. Увогуле ж, я думаю, не варта супрацьпастаўляць чытанне звычайнай кнігі і інтэрнэту. Іх трэба ўспрымаць як два кірункі адной і той жа справы.



**Наталля Аўдзеева, старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры:**

— Любая кніга, якая нясе нам веды і абуджае ў нас лепшыя пачуцці, — самая вялікая каштоўнасць, створаная талентам і інтэлектам чалавека. І ў канчатковым выпадку няважна, у якім выглядзе яна прадстаўлена, — у друкаваным ці электронным. Але, калі ёсць магчымасць выбару, я аддаю перавагу кнізе, якую можна ўзяць у рукі, адчуць яе непаўторную энергетыку, асалоду часам не толькі ад зместу, але і майстэрства яго ўвасаблення.



**Уладзімір Савіч, старшыня Беларускага саюза мастакоў:**

— Я не ўмею карыстацца інтэрнэтам. Але нават калі б і ўмеў, усё роўна аддаў бы перавагу кнізе. Любы від мастацтва — гэта душа чалавека. Колькі людзей прыклала сэрца, працу, талент да стварэння кнігі. Кладуцца мне на душу перш за ўсё тыя творы, якія сугучны з маімі разважаннямі, тым, чым занятая мая душа. Але ж, разам з тым, перавагу аддаю гістарычным і філасофскім творам. Здараецца, што, калі чытаю цікавы твор і мае думкі сыходзяцца з думкамі героя, мы, так бы мовіць, выходзім на адну прамую. Бывае, што чалавек мне нешта падказвае, а бывае, і спрачаюся з ім.

**Падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ПЕНСІЯНЕРЫ Ў БЕЛАРУСІ ЗМОГУЦЬ ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПАМЕР ПЕНСІІ ПРЫ БОЛЬШ ПОЗНІМ ВЫХАДЗЕ НА ЯЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У адпаведнасці з раней дзеючым заканадаўствам прадугледжвалася павышэнне памеру пенсіі па ўзросце за работу пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту без атрымання пенсіі на 1 працэнт заробку, які прымаецца для вылічэння пенсіі, за кожныя 2 поўныя месяцы такой работы. Так, калі жанчына, якая мае стаж работы 37 гадоў, выйшла на пенсію ў 55 гадоў, то памер яе пенсіі складзе Br1401 тыс. Пры звароце праз 5 гадоў пасля надыходу пенсійнага ўзросту памер яе пенсіі пры раней дзеючай норме павялічыўся б на Br642 тыс., або на 45,8 працэнта, і склаў бы Br2043 тыс. У адпаведнасці з новымі нормамі яе пенсія за адкладзены выхад на 5 гадоў узрасце на Br1031 тыс., або на 73,6 працэнта, і будзе складаць Br2433 тыс.

Акрамя таго, у адпаведнасці з указам павялічыцца выплата па ўжо набытых правах на павелічэнне памеру пенсіі за адкладзены выхад на яе.

Указам таксама прадугледжваецца пры вылічэнні заробку для працоўнай пенсіі ўлічваць залічаныя ў стаж работы перыяды дзейнасці, на працягу якіх не праводзілася выплата абавязковых страхавых узносаў у фонд.

У адпаведнасці з заканадаўствам пры вылічэнні пенсіі ў стаж нараўне з работай, калі праводзіцца выплата ўзносаў, уключаюцца перыяды іншай дзейнасці, на працягу якіх узносы не выплачваюцца (ваенная служба, вучоба на дзённай форме атрымання адукацыі, догляд дзяцей, інвалідаў I групы і састарэлых, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту). Пры вызначэнні заробку такія перыяды прапускаюцца.

З улікам таго, што пры вылічэнні пенсій кожны год стажу ацэньваецца ў працэнтах ад заробку, а заробкі ва ўсіх розныя, то аднолькавыя па сваім змесце перыяды маюць у пенсіі розную вартасць.

Указам устаноўлена адзіная вартасць усіх перыядаў без выплаты ўзносаў пры назначэнні пенсіі і ўключэнне такіх перыядаў пры разліку заробку.

Як растлумачылі ў прэс-службе, устанаўленне больш важкай даплаты за адкладзены зварот па пенсію, уніфікацыя вартасці перыядаў без выплаты ўзносаў і ўключэнне іх пры разліку заробку ў комплексе будуць садзейнічаць зніжэнню прытоку пенсіянераў і павышэнню эфектыўнасці дзяржаўных расходаў.

Гэтыя нормы будуць распаўсюджвацца на сённяшніх работнікаў, якія яшчэ фарміруюць свае правы на пенсійнае забеспячэнне.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ НАРОДНУЮ АРТЫСТКУ БЕЛАРУСІ ЛЮДМІЛУ ЯФІМАВУ З ЮБІЛЕЕМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў галоўнага дырыжора Заслужанага калектыву «Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы» Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі народную артыстку Беларусі Людмілу Яфімаву з юбілеем.**

«Свой лёс Вы назаўсёды звязалі з музычным мастацтвам, прысвяціўшы яму ўсе душэўныя сілы, талент і натхненне. Дзякуючы Вашай старанннай, нястомнай працы Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Рыгора Шырмы сёння з'яўляецца ўзорам высокага прафесіяналізму і выканальніцкага майстэрства», — адзначаецца ў віншаванні.

«Спадзяюся, што і ў далейшым Вы будзеце знаходзіцца ў нястомным творчым пошуку, плённа і самааддана служыць нацыянальнай культуры, праслаўляць нашу Айчыну», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## НАПРЫКАНЦЫ ТЫДНЯ ПАЦЯПЛЕЕ ДА ПЛЮС 17

**У першай палове тыдня надвор'е ў Беларусі будзе фарміравацца пад уплывам атмасферных франтоў, што рухаюцца да нас з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму чакаецца няўстойлівае надвор'е, калі часам будуць назірацца ападкі ў выглядзе дажджу, а па поўначы Беларусі — дождж і мокры снег. Прагназуецца парывісты заходні вецер да 15—20 м/с, а месцамі па поўначы ажно да 23 м/с. У аўторак удзень 2—8 цяпла, на паўднёвым захадзе — плюс 9—12 градусаў. Уначы на сераду 0—7 цяпла, на поўначы краіны пры праясненнях да 3 марозу, удзень 21 сакавіка — плюс 3—9, на паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей да 10—13 цяпла.

У другой палове тыдня праз тэрыторыю Беларусі пачне рухацца цёплы атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы, таму ўначы паўсюдна, а ўдзень месцамі пройдуць дажджы. Пацяплее. Уначы на чацвер будзе ўжо 0—плюс 7, удзень — 4—11 цяпла, на захадзе да 12—15 градусаў вышэй за нуль.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, напрыканцы тыдня да нас завітае сапраўднае цяпло. Уначы чакаецца 0 — плюс 7, удзень — ад 5 да 12 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да 13—17 градусаў вышэй за нуль. А гэта ўжо вясна...

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Да ведама

## НЕБЯСПЕЧНЫЯ ПРАДУКТЫ

Апошнім часам у Гродне актывізаваўся стыхійны гандаль прадуктамі харчавання. У шэрагу месцаў амаль штодзённа прапануюць «з рук» купіць мясныя вырабы, кансервы, свежую і вараную агародніну, салаты і іншыя нарыхтоўкі хатняй вытворчасці.

Для кантролю за сітуацыяй створаны камісіі ў складзе работнікаў міліцыі, санітарных службаў, упраўлення гандлю гарвыканкама. Аднак, нягледзячы на папярэджанні, гандляры працягваюць прадаваць гродзенцам патэнцыяльна небяспечную прадукцыю. Адна з прычын у тым, што самі жыхары стымулююць несанкцыянаваны гандаль, зазначае Гродзенскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі і папярэджвае: набыццё прадуктаў харчавання ў неўстаноўленых для гэтага месцах небяспечна для здароўя. Не выключана верагоднасць атрымаць харчовае атручэнне, захварэць на вострыя кішэчныя інфекцыі, туберкулёзам і іншымі інфекцыйнымі захворваннямі, таму што гэтыя прадукты прадаюцца непасрэдна «з зямлі» альбо з брудных скрыняў, без належнага тэмпературнага рэжыму, асобамі, якія не прайшлі медыцынскі агляд.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

**Барыс БАТУРА:**

# «БЕЗ РАЗВІЦЦЯ БІЗНЭСУ НЕ БУДЗЕ НІ СЯРЭДНЯГА КЛАСА, НІ 500 ДОЛАРАЎ ЗАРПЛАТЫ»

**Больш за год дзейнічае Дырэктыва № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь», але эфект ад гэтага дакумента ацэньваецца па-рознаму: прадпрымальнікі скардзяцца, што рэалізацыя яе палажэнняў ідзе занадта павольна, а чыноўнікі, як правіла, не пагаджаюцца: маўляў, усё ідзе згодна з планам. У прынцыпе, зразумець можна і тых, і тых, бо першыя хутчэй хочуць працаваць у добрым бізнэс-асяроддзі, а другія — не хочуць губляць прэміі за зрыў тэрмінаў. Але радуе адно: паціху чыноўнікі прывыкаюць да думкі, што бізнэс — аснова развіцця эканомікі краіны.**

— Мы паставілі задачу, каб да канца пяцігоддзя 50% даходнай часткі бюджэту вобласці фарміравалася за кошт дзейнасці прадпрымальніцтва. І ў прынцыпе, стабільнасць у грамадстве — гэта стварэнне ўстойлівага сярэдняга класа, а развіццё прадпрымальніцтва якраз і накіравана на стварэнне гэтага сярэдняга класа, — выказаў меркаванне **Барыс БАТУРА, старшыня Мінскага аблвыканкама,** на пасяджэнні, дзе абмяркоўваўся працэс выканання палажэнняў Дырэктывы № 4.

Прыватны бізнэс усё актыўней уносіць сваю лепту ў фарміраванне валавога рэгіянальнага прадукту Мінскай вобласці. У прыватнасці, па словах **Аляксандра ТУРЧЫНА, старшыні камітэта эканомікі Мінаблвыканкама**, калі ў 2008 годзе ўдзельная вага малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў ВРП складала 18%, то ў 2010 годзе на 4,4 працэнтнага пункта больш — 22,4%. Што тычыцца паступленняў у кансалідаваны бюджэт, то ад малога і сярэдняга бізнэсу яны за 2011 год склалі 1,8 трлн рублёў — 24,5% у агульных паступленнях і 38,6% у бюджэце вобласці. Толькі ад суб'ектаў малога прадпрымальніцтва паступленні павялічыліся ў 1,5 раза ў параўнанні з 2010 годам і склалі 1,43 трлн рублёў.

Усяго ў Мінскай вобласці па стане на пачатак 2012 года прадпрымальніцкую дзейнасць ажыццяўлялі 45,5 тысячы суб'ектаў гаспадарання. Найбольшая колькасць іх сканцэнтравана ў Мінскім (21,4%), Барысаўскім (12,4%) і Маладзечанскім (11,1%) раёнах. Напрыклад, у Старадарожскім раёне ажыццяўляюць дзейнасць 302 бізнэсмены (0,7%), Крупскім — 382 (0,8%), Капыльскім — 487 (1%), Любанскім — 435 (1%). Тое самае атрымаецца, калі паглядзець на колькасць суб'ектаў прадпрымальніцтва на 1 тысячу жыхароў — калі ў Мінскім раёне іх 65, то ў Старадарожскім, Крупскім, Капыльскім і Любанскім — ад 13 да 15. Аляксандр Турчын лічыць, што гэты паказчык сведчыць пра тое, што ў названых раёнах не надаецца належнай увагі недзяржаўнаму сектару эканомікі.

— Я лічу, што мы павінны падтрымліваць прадпрымальніцкую ініцыятыву, бо яна дазваляе не толькі павялічваць даходы бюджэту, але (што немалаважна) і ствараць новыя працоўныя месцы. Да таго ж замацаваць працоўныя рэсурсы ў сельскай мясцовасці і малых гарадах можа наяўнасць свайго бізнэсу і ўласнасці. Таму мы павінны спрыяць стварэнню пазітыўнага іміджу прадпрымальніцтва ў грамадстве, — перакананы Аляксандр Турчын.

Цікава, дарэчы, што на Міншчыне ўдзельная вага юрыдычных асоб бязведамаснай падначаленасці ў агульным аб'ёме вытворчасці прамысловай прадукцыі паціху ўзрастае: у 2010 годзе яна складала 17,8%, у 2011 — 19,5%. Аляксандр Турчын адзначыў, што гэта самы высокі вынік сярод усіх абласцей краіны, — і нават пры тым, што ў Мінскай вобласці знаходзяцца такія прамысловыя гіганты, як «Беларуськалій» і «БелАЗ». Аднак варта дадаць, што у некаторых раёнах (Клецкім, Слуцкім, горадзе Жодзіна) удзельная вага прыватных прадпрыемстваў зусім малая — менш за 5%, а ў Бярэзінскім, Вілейскім, Мядзельскім і Стаўбцоўскім раёнах вытворчых прыватных арганізацый і зусім няма...

### ЧЫНОЎНІКІ ЎЖО НЕ БАЯЦЦА ПРАДАВАЦЬ МАЁМАСЦЬ ЗА 1 БАЗАВУЮ?

Для бізнэсменаў-пачаткоўцаў адным з сур'ёзных бар'ераў з'яўляецца адсутнасць плошчаў для офісаў і вытворчасцяў. Каб дапамагчы бізнэсу, у Мінскай вобласці за 2011 год прадпрымальнікам было перададзена 275 аб'ектаў нерухомасці, якія дагэтуль неэфектыўна выкарыстоўваліся: з іх 95 было прададзена на аўкцыёне з усталяваннем пачатковай цаны продажу ў памеры адной базавай велічыні, 121 аб'ект перададзены ў бязвыплатнае карыстанне пад канкрэтныя інвестыцыйныя праекты. Разам з тым, Аляксандр Турчын адзначыў, што на тэрыторыі вобласці яшчэ засталася значная колькасць аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца, — толькі ў камунальнай уласнасці іх яшчэ больш за 350. Дарэчы, вельмі радуе, што мясцовыя ўлады перасталі баяцца прадаваць аб'екты нерухомасці за адну базавую велічыню:

— За мінулы год мы прадалі 20 аб'ектаў, — расказвае **Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, старшыня Слуцкага райвыканкама**. — З іх 13 аб'ектаў — за 1 базавую велічыню па 108-м Указе Прэзідэнта. Мы актыўна гэтым карыстаемся. Для параўнання хачу сказаць, што за 2010 год мы такіх аб'ектаў прадалі толькі 5. Сапраўды, тут адчуваецца і падтрымка аблвыканкама. Мы не баімся, што потым нехта прыйдзе і праверыць, на якіх умовах і як мы ўзаемадзейнічаем з камерцыйнымі структурамі...

Разам з тым, ёсць і пэўныя праблемы з рэалізацыяй не патрэбнай дзяржаве маёмасці нават за 1 базавую велічыню. Напрыклад, як расказаў Уладзімір Даманеўскі, былыя вайсковыя казармы райвыканкам гатовы аддаць бізнэсменам бясплатна, але рыхтаваць адпаведныя дакументы на гэтыя аб'екты трэба за кошт сродкаў бюджэту, што складае далёка не адну базавую велічыню

— Ці вось яшчэ такі выпадак: у малочнатаварным комплексе «Белічы» ёсць будынак кацельнай, які не выкарыстоўваецца. Даволі-такі нядрэнны будынак. Чалавек папрасіў: маўляў, дайце мне гэтую кацельную, я там арганізую рамонт машын. Але як мы там, дзе вырабляецца малако, дазволім рамантаваць машыны? Як паступіць? Прапануем іншыя аб'екты — не, не хоча браць...

Яшчэ адно праблемнае пытанне — выкуп прадпрымальнікамі арандаваных вытворчых памяшканняў:

— Сёння ўласнікі не заўсёды зацікаўлены ў продажы аб'ектаў нерухомасці, бо рэгулярна атрымліваюць невытворчыя даходы ў выглядзе арэнднай платы. У сваю чаргу, арандатары не зацікаўлены ў падтрыманні вытворчых памяшканняў у тэхнічна спраўным стане, бо яны не з'яўляюцца іх уласнікамі і ў любы момант дамова арэнды можа быць скасавана, — кажа Аляксандр Турчын.

Безумоўна, гэтую праблему нейкім чынам трэба вырашаць, тым больш што ў Дырэктыве № 4 запісана: суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці трэба прадаставіць права выкупу дзяржмаёмасці, калі яны яе арандуюць на працягу трох гадоў і больш.

### ЧЫНОЎНІКІ БІЗНЭСУ ДАПАМАГАЮЦЬ ЦІ ЧЫНЯЦЬ ПЕРАШКОДЫ?

Аляксандр Турчын выказаў меркаванне, што на месцах прадпрымальнікі не маюць нейкіх адміністрацыйных перашкод, а наадварот, мясцовыя ўлады аказваюць ім усялякае садзейнічанне. Тое самае кажа і старшыня Слуцкага райвыканкама:

— У нас няма ніводнай скаргі, таму я не згодны, што мы не дапамагаем прадпрымальнікам станавіцца на ногі. Мы перыядычна сустракаемся з прадпрымальнікамі, але, на жаль, у іх такі менталітэт, што яны просяць даць месца, каб півам гандляваць у кіёску, фруктамі на вуліцы і г. д. А гэта сёння не ўпісваецца ў канцэпцыю...

А вось Барыс Батура не лічыць, што чыноўнікі не ствараюць адміністрацыйных бар'ераў:

— Я б не гаварыў так, што на месцах няма прадузятага стаўлення да прадпрымальніцтва. Ёсць і колькі хочаш — толькі я магу прывесці з дзясятак прыкладаў... Трэба прадпрымальніка ну, можа, не на руках насіць — не будзем утрыраваць. Але, прынамсі, павінна быць блізка да гэтага. Зарэгістраваў — і ўвесь час яго трэба падштурхоўваць. Для чаго створаны цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва, якія павінны гэтым займацца... Мы не выйдзем ніколі на 500 долараў зарплаты, калі не будзем сур'ёзна займацца гэтай праблемай, — заявіў старшыня Мінаблвыканкама, гаворачы пра развіццё бізнэсу. — Мы павінны быць кроўна зацікаўлены, каб у нас прадпрымальніцтва атрымала сур'ёзнае развіццё. І ў нас няма аб'ектыўных прычын, якія маглі б гэтаму перашкодзіць.

Як расказаў Аляксандр Турчын, аблвыканкам выступіў з прапановай (яна была падтрымана Мінэканомікі) па аб'яднанні двух нарматыўных дакументаў у адзін — Дэкрэта Прэзідэнта № 1 «Аб стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг)» і Дэкрэта Прэзідэнта № 9 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці ў сельскай мясцовасці».

— Гэты праект новага дэкрэта накіраваны на радыкальнае паляпшэнне ўмоў развіцця рэгіёнаў і стымулявання дзелавой актыўнасці перш за ўсё нацыянальных інвестараў. Ільготныя рэжымы плануецца распаўсюдзіць на індывідуальных прадпрымальнікаў, шмат новаўвядзенняў будзе з маёмаснымі і зямельнымі адносінамі. Гэтым праектам прадугледжваецца магчымасць набыцця бізнэсменамі маёмасці ў растэрміноўку, плануецца пашырыць пералік абсталявання, якое ўвозіцца на льготных умовах. Папярэднія Дэкрэты №№ 1 і 9 паўплывалі на развіццё бізнэсу нязначна: ільготамі скарысталіся толькі 2,2% суб'ектаў гаспадарання. А праект новага дэкрэта, як мы лічым, павінен стаць рухомай сілай у развіцці рэгіёнаў, у развіцці вытворчага прадпрымальніцтва на тэрыторыі сельскай мясцовасці і малых гарадоў з колькасцю насельніцтва да 50 тысяч чалавек, — адзначыў Аляксандр Турчын і дадаў, што буйны прамысловы сектар — гэта базіс, аднак паступовая структура эканомікі мяняецца і вядучая роля пераходзіць да недзяржаўнага сектара.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ПУШЧУ́ МЯДЗВЕДЗЯ Ў ПУШЧУ?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Бурыя мядзведзі ў хуткім часе могуць зноў пасяліцца ў Белавежскай пушчы. Вяртанне гэтага віду туды мяркуюць ажыццявіць сумесна з Франкфурцкім заалагічным таварыствам, прадстаўнікі якога ўжо прыязджалі ў Беларусь, каб абмеркаваць далейшае супрацоўніцтва.**

З вышэйназванай тэрыторыі мядзведзі поўнасцю зніклі ў XIX стагоддзі. Вядома, што пасля, у часы, калі тэрыторыя Белавежскай пушчы адносілася да Польшчы, улады спрабавалі аднавіць папуляцыю мядзведзя, перасяліўшы некалькіх звяроў з заапаркаў, але з гэтага нічога не атрымалася. Тым больш што справе перашкодзіў пачатак вайны.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» галоўны навуковы супрацоўнік дзяржаўнага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах» Вадзім Сідаровіч, бурыя мядзведзі сустракаліся на ўсёй тэрыторыі Беларусі яшчэ ў XIX стагоддзі. Цяпер справы ў мядзведжай папуляцыі планамерна пагаршаюцца:

— Згодна з падлікам за 2002—2004 гады, у беларускіх лясах жыло больш за 200 мядзведзяў. Пераважна яны сустракаліся на поўначы краіны і ў некаторых цэнтральных рэгіёнах — Бярэзінскім, Барысаўскім. У 2008 годзе ўжо налічвалася крыху больш за 100 мядзведзяў. За апошнія два гады, калі верыць лічбам, колькасць бурых мядзведзяў знізілася прыкладна да 63 асобін.

Па словах Вадзіма Сідаровіча, гэта крытычная мяжа. Папуляцыя мядзведзяў змяншаецца з-за «неспакойнага» жыцця ў зімовы час, якое ім даводзіцца весці з-за частых і паўсюдных загонных паляванняў на капытных. Мядзведзіца, калі спужаецца шуму ад палявання, кідае нованароджаных медзведзянят і больш да іх не вяртаецца. Другая прычына «неспакою» — нарыхтоўка драўніны ў старых яловых лясах. Мядзведзі выбіраюць для зімоўкі менавіта такія месцы, а людзі, што спілоўваюць дрэвы, ім перашкаджаюць.

Зараз беларускі бок чакае пацвярджэння ад Франкфурцкага заалагічнага таварыства аб згодзе падтрымаць першы этап вяртання мядзведзя ў Белавежскую пушчу. Мішкі, што стануць асновай пушчанскай папуляцыі, наўрад ці будуць беларускага паходжання. Як адзначылі ў «НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах», простае перасяленне той невялікай колькасці «айчынных» звяроў з адной тэрыторыі на другую ніякай карысці не дасць, бо для аднаўлення папуляцыі патрэбна мінімум дваццаць дарослых мядзведзяў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## АБЗАЦ

◢ **У красавіку Беларусь пачне пастаўляць сметанковае масла ў Венесуэлу. На працягу гэтага года запланавана адправіць туды 720 тон масла.**

◢ Сістэмы ацяплення ў Мінску пераведзены ў рэжым прапальвання, паведаміў учора журналістам начальнік аддзела энергетыкі Мінгарвыканкама Анатоль Лаўнічук. Гэта звязана з тым, што тэмпература знадворнага паветра на працягу бліжэйшага часу будзе плюсавай і толькі праз тыдзень чакаецца яе нязначнае зніжэнне. У адміністрацыйных, прамысловых будынках у выхадныя дні прапанавана ацяпленне адключаць.

◢ **Школьнік моцна апёкся пры тушэнні палаючай сухой травы ў Ганцавічах. У выхадныя хлопчык 2001 г.н. гасцяваў у дзядулі. Пры спробе патушыць полымя ад спальвання сухой расліннасці на пустцы ён атрымаў апёкі 1—3-й ступеняў і быў дастаўлены ў бальніцу. У дзіцяці апалена 18% цела — твар, шыя, рука, нага, а таксама дыхальныя шляхі.**

◢ У Гродзенскай вобласці перавярнулася цыстэрна з 20 т прапан-бутану. Аварыя адбылася ў пас. Кабыльнікі Свіслацкага раёна за 500 м ад тэрыторыі філіяла РУП ««Беларуснафта-Свіслач ГАЗ». Аўтацыстэрна згубіла кіруемасць, з'ехала на ўзбочыну і звалілася на бок. Пацярпеў кіроўца, які са страсеннем мозга і ўдарам груднай клеткі трапіў у бальніцу. Ёмістасць вытрымала ўдар, не была пашкоджана, уцечкі вуглевадароду не было. Змесціва цыстэрны перакачалі ў іншую.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **У Тайландзе таксіст вярнуў пасажыру мех з каштоўнасцямі. Як высветлілася, пасажырам быў уладальнік ювелірнай крамы, ён забыў у таксі мех з залатымі ўпрыгажэннямі на 350 тыс. долараў. Пры гэтым забыўлівы мужчына не запомніў нават нумар аўтамабіля. Ён звярнуўся ў паліцыю, указаўшы толькі тое, што машына была ружовага колеру. Паліцэйскім удалося выявіць аўто на запісах камер назірання за бяспекай горада, але нумар і тут выявіць не ўдалося. Тым часам таксіст сам звярнуўся ў паліцыю. Ён прынёс каробкі з золатам у студыю паліцэйскай хвалі радыё Бангкока. Шчаслівы ювелір аддзячыў сумленнага кіроўцу таксі двума залатымі ланцужкамі.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## Новыя МММшчыкі — у СІЗА

**Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі завёў крымінальную справу ў дачыненні да злачыннай групы, якая займалася незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.**

Як паведамляюць у Цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ, з 2011 года па 16 сакавіка 2012 года злачынная група дзейнічала ад імя незарэгістраванага ў належным парадку на тэрыторыі нашай краіны суб'екта гаспадарання «МММ-2011» дзеля атрымання даходу ў асабліва буйным памеры. Група прыцягвала грашовыя сродкі беларусаў — беларускія рублі і замежную валюту на адкрытыя ў айчынных банках разліковыя рахункі. Укладчыкам, зразумела, абяцалі хуткае ўзбагачэнне ад такіх аперацый. Удзельнікі злачыннай групы былі затрыманы ў офісе ў цэнтры Мінска, дзе ажыццяўляліся фінансавыя аперацыі і праходзілі сустрэчы з укладчыкамі. Падчас вобыску канфіскаваны банкаўскія крэдытныя пластыкавыя карткі, на рахунках якіх знаходзілася звыш 800 млн беларускіх рублёў. Зараз праводзіцца комплекс аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў і следчых дзеянняў. Затрыманыя змешчаны ў следчы ізалятар КДБ.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## У МЕТРО ЗНОЎ ІНЦЫДЭНТ З ПАДЗЕННЕМ...

**Чацвёрты з пачатку сакавіка выпадак падзення чалавека на рэйкі зафіксаваны ў сталічным метрапалітэне. Прычым тры з іх адбыліся на працягу першай дэкады месяца. А ўсяго з пачатку года ў метро гэта ўжо шосты па ліку інцыдэнт падобнага кшталту.**

На гэты раз здарэнне мела месца ўвечары 18 сакавіка на станцыі «Плошча Леніна». Мужчыне 1981 года нараджэння, жыхару Барысава, стала дрэнна, і ён упаў на рэйкі. Супрацоўнікі станцыі паспелі аператыўна адрэагаваць: было адключана напружанне і пацярпелага паднялі на платформу. Паколькі здарэнне адбылося ўвечары, калі інтэрвалы паміж цягнікамі павялічваюцца, спыненне руху не было: напружанне адсутнічала каля трох хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДВАЙНАЯ «РЭПЕТЫЦЫЯ ЗАМУЖЖА»

4-гадовая гамяльчанка, гуляючы з цацкамі, надзела на сярэдні палец левай рукі пластмасавую дэталь у выглядзе кольца. Бацькі не змаглі зняць нечаканае «ўпрыгажэнне» самастойна. Яго здымалі супрацоўнікі МНС. Роўна праз дзве гадзіны сітуацыя паўтарылася... на другім канцы Гомеля. Пластмасавая трубачка засела на пальцы 3-гадовай дзяўчынкі. І зноў выратавальнікі прыйшлі на дапамогу. Характэрна, што ў абодвух выпадках «пярсцёнкі» былі жоўтага колеру.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



Фота МНС.

# РАМАНТЫКА І РЭАЛІІ «НОВАГА СВЕТУ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Старшыня аблвыканкама цікавіцца, што думаюць на гэты конт удзельнікі нашай экскурсіі. Гучыць прапанова — перадаць будынкі пад вучэбныя карпусы, інтэрнат для ГрДУ імя Янкі Купалы. Аднак лёгка сказаць... Умовы там такія, што вельмі праблематычна наладзіць і вучэбны працэс, і пражыванне студэнтаў. Тым больш, што ўжо сёння падраздзяленні ўніверсітэта, якім не хапае месца ў галоўным корпусе, раскіданы літаральна па ўсім горадзе. Таму выйсце, відавочна, не ў перадачы «купалаўцам» чарговых, зусім не прыстасаваных для ВНУ будынкаў, а ў сучасным, магутным універсітэцкім корпусе, які ўжо праектуецца.

Іншых рэальных варыянтаў, каб зацікавіць патэнцыяльных гаспадароў былых «памежных» уладанняў, пры гэтым не парушыўшы патрабаванняў па ахове гісторыка-культурных аб'ектаў, пакуль няма.

Наступная праблема абмяркоўваецца на скрыжаванні вуліц Горкага і Міцкевіча: якая будучыня ў гэтага жылля? З аднаго боку, драўляная забудова ў буйным горадзе можа стаць рэдкасцю, «фішкай» яго аблічча. А з іншага боку, лічыць вопытны будаўнік і праекціроўшчык, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Дзяшко, шэраг будынкаў знаходзіцца ў аварыйна-небяспечным стане і ўжо не падлягае аднаўленню.

Што і пацвердзілі жыхары дома № 1 па вуліцы Міцкевіча, у якіх адно жаданне — хутчэй адсюль з'ехаць, пакуль у кватэрах не абвалілася столь. Ды і ў суседкі, **гаспадыні прыватнага дома Лідзіі МІНЮЧЫЦ** зусім няма падстаў «казыраць» тым, што пражывае ў «Новым свеце». Зразумела, кажа жанчына, гэта гісторыя горада, але... Людзей не задавальняюць пячное ацяпленне, халодная вада, выгоды на двары... Газ да пліты праведзены, цяпер трэба займацца ацяпленнем, ды няма грошай. Таму заказалі па «рэкламцы» машыну дроў і ў нядаўнія маразы двойчы на дзень палілі печ. Бадай, адзіны плюс — побач агарод.

Паводле слоў Лідзіі Мінючыц, яе муж, якому гэты дом дастаўся ў спадчыну, пераязджаць адсюль не збіраецца, нават калі б і прапанавалі. А вось яна згадзілася б.

Крочым далей па вуліцы Міцкевіча. Вось драўляны дом з даволі арыгінальнай разьбой, але вельмі абшарпаны ... Можа, унутры стан добры? Не, адказвае гаспадыня, шмат што неабходна рамантаваць, падлогу, вокны мяняць, фундамент умацоўваць. На такі капітальны рамонт у горада, на чыім балансе знаходзіцца жыллё, сродкаў няма. Ды і з афарбоўкай не атрымліваецца. Гаспадары прапанавалі зрабіць гэта за свой кошт пры ўмове, што іх на нейкі перыяд вызваляць ад плацяжоў на капрамонт. Але і такі варыянт аказаўся немагчымым.

Іншы варыянт быў прапанаваны пазней, калі ў інстытуце «Гроднаграмадзянпраект» абмяркоўваліся канкрэтныя крокі па вырашэнні праблем «Новага свету». Чаму б не выкарыстаць у інтарэсах гэтага квартала і яго жыхароў магчымасці валанцёраў, студэнтаў — будаўнікоў ГрДУ імя Янкі Купалы?

Пры гэтым які сэнс перабольшваць значэнне тых, па сутнасці, халуп і баракаў, якія ёсць у «Новым свеце», альбо аднаўляць за вялізныя грошы тое, што ўжо практычна немагчыма вярнуць да нармальных умоў пражывання?

Адпаведную ацэнку **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА** лічыць неабходным правесці літаральна па кожным будынку ў гэтым квартале. Вызначыць, якія з іх з'яўляюцца старымі, аварыйнымі і падлягаюць зносу. Прычым, калі даецца дазвол на ўзвядзенне там новых будынкаў, архітэктурная служба павінна ставіць умову па іх стылявым падабенстве з гістарычнай забудовай. Менавіта такі падыход, магчыма, з'яўляецца аптымальным у сённяшніх умовах: на месцы гістарычнага будынка, які не адпавядае элементарным умовам пражывання, можа з'явіцца дом у стылі рэтра, але з камфортным унутраным «начыннем».

Па выніках нашай экскурсіі па «Новым свеце» вырашана вывучыць замежны вопыт захавання драўлянай гістарычнай забудовы, яе арганічнага спалучэння з новымі архітэктурнымі тэндэнцыямі і сучаснымі матэрыяламі. Акрамя таго, старшыня аблвыканкама лічыць неабходным пры праектаванні альбо рэгенерацыі такіх раёнаў ствараць грамадскія саветы, у склад якіх уваходзілі б і гісторыкі.

**Аляксандр ТАРАНЕНКА, галоўны архітэктар істытута «Гроднаграмадзянпраект»:**

— Архітэктары таксама заклапочаны лёсам гэтага гістарычнага квартала — неаднойчы яго абыходзілі, кожны будынак агледзелі. Мы хочам захаваць дух «Новага свету» — маштабы забудовы (не больш за два — тры паверхі), сістэму вуліц, якая там склалася.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

**Дарэчы:**

*Назва «Новы свет» (так называлі Амерыку яе еўрапейскія першаадкрывальнікі) у Беларусі вельмі распаўсюджаная. На Гродзеншчыне вёска «Новы свет» знаходзіцца ў Іўеўскім раёне, на Брэстчыне — у Баранавіцкім. А вось у Магілёўскай і Гомельскай абласцях — ажно па тры населеныя пункты з такой назвай, прычым на Гомельшчыне ўсе — у Буда-Кашалёўскім раёне.*

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.



# «...КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АДЧУВАЦЬ СЯБЕ БЕЛАРУСАМІ, ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ»




У час сустрэчы звяздоўцаў з жыхарамі раёна.

**...Гэта ўжо завядзёнка — з кожнай камандзіроўкі-вандроўкі нешта прывозіць. Ну хоць бохан хлеба, калі на іншае часу няма.**
**З Ляхавічаў прыехалі позна — сям'я (прынамсі, мая. — Аўт.) даўно павячэрала. Аднак не стрывала і да гасцінца прылажылася. Добры, прызнала, хлеб!**
**Гэта — адно з уражанняў. Што да іншых...**

Перад пачаткам «вялікай чытацкай «лятучкі» такая ж вялікая актавая зала Ляхавіцкага райвыканкама была амаль поўнай. Прыйшлі падпісчыкі газеты, паштавікі. Асобны дзякуй кіраўніцтву выканкама, якое запрасіла на сустрэчу актыў — ідэолагаў, старшыняў сельскіх Саветаў, кіраўнікоў школ, бібліятэкараў... Нехта з іх «Звязду» праглядае і чытае на працы, нехта — купляе ў шапіку, у некага яе выпісвалі і выпісваюць бацькі... Што, вядома ж, спрашчала задачу выязнога дэсанта: у Ляхавіцкім раёне, дзе ў «Звязды» амаль 340 падпісчыкаў, не было патрэбы падрабязна распавядаць пра змест выдання, яго тэматычныя старонкі і асноўныя рубрыкі. Ды і не гэта, уласна, мелі на мэце. Галоўнае было выслухаць заўвагі, прыняць прапановы, разам падумаць, што зрабіць, каб газета стала цікавейшай...

Аднак без кампліментаў не абышлося таксама.

— Нашай сям'і, нашаму саюзу з Людмілай Браніславаўнай хутка 60 гадоў. І столькі ж — мы выпісваем «Звязду». Ніколі ёй не здраджвалі, бо гэта, калі коратка, наша духоўнае багацце, — гаварыў, прынамсі, былы настаўнік (калі былымі яны бываюць?) **Васіль Іванавіч Ясевіч** і тлумачыў чаму, казаў, што «Звязда» не проста інфармуе, не проста дапамагае людзям вырашаць нейкія надзённыя пытанні — яна спрыяе ў тым, каб чалавек стаў лепшым.



Віншуем нашых чытачоў, якія атрымалі прызы ад «Звязды».

— Працуюць на гэта многія журналісты, — працягваў чытач, — але ж мы з Людмілай Браніславаўнай вылучаем траіх: Анатоля Клешчука, Яўгена Пясецкага і Валянціну Доўнар. У іх працы столькі мудрасці, столькі шчырасці, столькі замілаванасці да людзей і нашай зямлі, што многія публікацыі мы захоўваем, каб потым (і, магчыма, не раз) перачытаць.

Адну са звяздоўскіх выразак (дарэчы, сямігадовай даўнасці) Васіль Іванавіч агучыў. Да таго ж гаварыў бездакорна па-беларуску, з добрым гумарам, без паперкі, без мікрафона. Зала, дзе шмат было вучняў, слухала, стаіўшы дыханне.

— Добра, што з'яўляюцца новыя прозвішчы (у тым ліку маладых — студэнтаў факультэта журналістыкі), добра, што даецца разнастайная інфармацыя. Але ж (умоўна) не трэба шмат пісаць пра тое, як вывесці барадаўку, бо яна ёсць у мяне і яшчэ, можа, у ста чалавек. А вось тое, што даецца для душы, патрэбна ўсім. Рэдкалегіі варта пра гэта памятаць!.. Людзям жа магу сказаць адно: калі вы хочаце адчуваць сябе беларусамі, выпісвайце «Звязду».

Тое, што ёсць рацыя ў гэтых словах, пацвердзіла і спадарыня Пабягайла, сям'я якой стала выпісваць нашу газету менавіта тады, калі ўсвядоміла сваю нацыянальную прыналежнасць. Што цікава, сама Валянціна Іванаўна нарадзілася ў Мінску. Тут, у вялікім і, на жаль, раскамоўным горадзе, скончыла школу і політэхнічны інстытут. На прафесіі яна — будаўнік, па складзе розуму, як падалося — даследчык, па стане душы — паэт...

— Не скажу, я пісала вершы і на рускай мове, — прызнавалася чытачка, — але ж яны мне даваліся цяжэй. А па-беларуску — як быццам хтось дапамагае мне, падказвае словы. Прычым, якіх і не чула...

З год таму Валянціна Іванаўна па волі выпадку (выйграла прыз у звяздоўскай гульні) трапіла ў рэдакцыю. З лёгкай рукі газеты ў снежні выдала першую кніжачку.

— Вельмі задаволена! — прызналася аўтарка. — Тым, па-першае, што літаральна ўсе мне ішлі насустрач, усе дапамагалі. І гэта няпраўда, што людзям не патрэбна цяпер прыгожае пісьменства. Ну вось выступала я ў Савеце ветэранаў. Колькі вершаў прачытала, пытаюся: «Можа, досыць?», кажуць: «Што вы... Чытайце яшчэ!» Запрашаюць мяне і ў школы. Спачатку адчувалася нейкая напружанасць: маўляў, вершы, па-беларуску... Але ж трэба ведаць, як іх паднесці... Да мяне праз 40- 45 хвілін дзеці ішлі па аўтографы, прасілі разам сфатаграфавацца... Так што муж мой цяпер баіцца, што я са сваёй папулярнасцю не паспею грады пасеяць... І ўсё гэта дзякуючы «Звяздзе».

Ёй, як высветлілася, Валянціна Іванаўна таксама прысвяціла верш — доўгі, хвалебны. Таму толькі пачатак:

*Я люблю сваю газету —*
*Беларускую «Звязду»:*
*Ў ёй — навіны ўсяго свету.*
*І мясцовыя знайду...*

Што тычыцца апошніх, у чытачкі ніякіх прэтэнзій: добра працуюць уласныя карэспандэнты па Брэсцкай вобласці. А вось пра тое, што робіцца ў свеце, газета, як лічыць спадарыня Пабягайла, піша мала.

Сачыла сям'я нашай пастаяннай чытачкі і за бурнай дыскусіяй, якую вялі на старонках «Звязды» настаўнікі. Праўду яны пісалі пра свае заробкі, пра нагрузкі, праверкі, пісаніну... А вось належнага рэагавання, нейкіх каментарыяў з Міністэрства адукацыі газета так і не дачакалася.

Ну вядома ж, гаварыла Валянціна Іванаўна і пра мову — прозай, вершам, заклікала залу размаўляць на ёй, чытаць, выпісваць «Звязду» і іншыя беларускамоўныя выданні.



«Пазнаю сваіх землякоў!» — зазначыў старшыня Ляхавіцкага раённага Савета дэпутатаў Яўген ЮРЛЕВІЧ (злева), прымаючы з рук мастака Алеся КАРШАКЕВІЧА сяброўскія шаржы.

...Каемся: не адразу папярэдзілі, што на гэты раз у творчы дэсант газеты «пракраўся» «Вожык» — літаральна: увесь час, пакуль мы вялі размову, у зале сядзеў карыкатурыст Аляксандр Каршакевіч і ціха маляваў... Смеху было, калі паказаў тое, што ў яго атрымалася, калі стаў знаёміць з новым старым часопісам, яго зместам.

— «Вожык» нікуды не знікаў, — гаварыў мастак, — проста многія пра яго забыліся. І шмат страцілі, бо часопіс заўсёды стараўся быць праўдзівым, патрэбным для сваіх чытачоў.

Адзін з іх, дарэчы, лічы, адразу ж знайшоўся:

— Я гадоў 15 запар выпісваў газету «Праўда» і часопіс «Вожык», — гаварыў дырэктар Малагарадзішчанскай школы-садка А.У. Тураў. — У газеце чытаў пра тое, як у жыцці павінна быць, а ў часопісе — як ёсць на самой справе...

Выпісвае Анатоль Уладзіміравіч і «Звязду», бо яна «сапраўды беларуская і нам усім яшчэ трэба вучыцца трымацца свайго».

...Што цікава — было ў каго (вучыцца): сустрэча падыходзіла да свайго завяршэння — час быў разыгрываць прызы. Зазвычай выцягнуць шчаслівыя «білецікі» мы даручалі некаму з дзяцей. На гэты раз іх не было... Але ж была моладзь, так што шукаць гаспадароў усім звяздоўскім прызам мы папрасілі адну з дзяўчат. Цягам розыгрышу адбылося знаёмства.

— Пасля школы я мару стаць журналістам, — на роднай мове, лёгенька, прыгожа гаварыла вучаніца 11-га класа СШ №1 Марына Жабік. — Пішу толькі па-беларуску — у мяне такі прынцып. І ўжо трохі друкуюся. Тры публікацыі былі ў звяздоўскай «Чырвонай змене»... Я вельмі рада, што ў нас ёсць беларускамоўныя газеты, што ў нашай школе працуе фальклорны гурт «Кужалёк», дзе мы можам танцаваць і спяваць песні Ляхавіччыны, што ў мяне цудоўная настаўніца беларускай мовы — Наталля Мікалаеўна Сідар, што з маімі артыкуламі ў «Звяздзе» працуе Алена Дзядзюля. Мы ліставаліся, і я вельмі ўдзячна ёй за падтрымку, за тое, што яна не шкадуе свайго часу...

А значыць, растуць (у тым ліку і ў Ляхавічах) нашы новыя кадры.

Жыве, мяркуе газета — працай розуму і душы яе супрацоўнікаў і, вядома ж, чытачоў, кожная сустрэча з якімі — і экзамен, і свята...

А найперш — падстава для сур'ёзных высноў.

**Валянціна ДОЎНАР, Уладзімір ЗДАНОВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

***P.S. Трэба, мусіць, сказаць, што сярод гасцінцаў з Ляхавічаў быў не толькі бохан хлеба: спадарыня Пабягайла пачаставала сваімі агуркамі-памідорамі. І тым самым падказала... новую рубрыку ў «Хатнюю энцыклапедыю». Называцца яна будзе «Рэцэпты чытачоў». Ці «...нашых бабуль». А можа неяк інакш? Пішыце. І, зразумела ж, выпісвайце!***

***Каб адчуваць сябе беларусамі!***

# ЛІТАРАТУРНЫЯ МАСТЫ ДРУЖБЫ

## Вітанне з Паднябеснай. З восьмага стагоддзя...





**Класік кітайскай літаратуры Лі Бо прыцягвае шырокую ўвагу беларускіх перакладчыкаў і выдаўцоў.**




І хаця нарадзіўся Лі Бо ў пачатку восьмага стагоддзя, упершыню яго вершы па-беларуску загучалі ў 1989 — на старонках зборніка «Тутэйшыя». Некалькі гадоў таму вершы ханьліня (у першым тысячагоддзі такое найвышэйшае вучонае званне давалі пры імператарскім двары) пераўвасобіў на мову Купалы народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін — у кнізе «Гуканне Усходу». На вечары Лі Бо, які прайшоў у сталічным Доме дружбы, свае пераклады паэтычных адкрыццяў класіка кітайскай літаратуры чытаў Мікола Мятліцкі. На мове арыгінала прыхільнікаў трапяткой вольналюбівай лірыкі знаёмілі з вершамі паэта-філосафа і песнямі на яго словы студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Беларускай акадэміі музыкі, а таксама саветнік па культуры пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь спадарыня Ван Жуй.

Са сваімі перакладамі Лі Бо на рускую мову выступіў выкладчык БДУ, паэт і мастак-каліграф Лі Цзо. Пра паездку ў Пекін, пра свае ўражанні ад знаёмства з сённяшнім Кітаем расказаў паэт Навум Гальпяровіч. Было агучана на вечары і вітанне ад старэйшыны пісьменніцкага цэху Кітая Гао Мана (нарадзіўся ў 1926 годзе, перакладчык А.С. Пушкіна, А. Ахматавай, М. Танка і С. Алексіевіч). «Калі б Лі Бо дажыў да нашых дзён, слухаючы вершы на беларускай мове, як узрадаваўся б ён! Думаю, што з'явіўся б бляск у яго вачах, напоўненых шчасцем і слязьмі, ды падняў бы ён келіх з віном і прачытаў бы верш пра дружбу нашых народаў!» — перадаў свае словы ўдзельнікам беларускай вечарыны Гао Ман.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# КАМУ ПАТРЭБЕН БАНК СІРОТ?

**Наталля ШЭХ, жанчына, якая ўсынавіла траіх з 5 сваіх дзяцей, і псіхолаг Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення, якая зараз знаходзіцца ў водпуску па доглядзе двайнят, лічыць, што змешчаны ў інтэрнэце адкрыты банк звестак пра дзяцей, якіх можна ўсынавіць, патрэбен перш за ўсё самім дзецям. Наталля сабрала пад Калектыўным зваротам у Міністэрства адукацыі больш за 500 электронных подпісаў. У пачатку сакавіка яе прыняў намеснік міністра адукацыі Віктар Якжык. Але яшчэ да гэтага, на этапе збору подпісаў, журналіст «Звязды» сустрэлася з Натальляй, каб падрабязней даведацца пра ініцыятыву, якая, на першы погляд, не такая ўжо і новая.**



— Усё пачалося з дзяўчынкі, ад якой адмовіліся ўсынавіцелі проста ў зале суда гады тры таму. Дзяўчынка мела асаблівасць — зрошчаныя пальчыкі на руцэ. Усынавіцелі ведалі гэта, яны ўжо пазнаёміліся з дзяўчынкай, бралі яе ў госці і... раптам спужаліся. Супрацоўнікі Цэнтра ўсынаўлення не маглі супакоіцца: як жа так, дзіця чакае... Яна, да таго ж, была з Друі, гэта на самай мяжы Беларусі з Латвіяй... І тады Нацыянальны цэнтр усынаўлення, з дазволу дзяржаўнага апекуна, змясціў яе фотаздымак на сваім сайце. Адгукнулася адна сям'я, другая, трэцяя...

**— «Звязда» змяшчала на сваіх старонках фотаздымкі дзяцей, якіх можна ўсынавіць, яшчэ ў 1993 годзе...**

— Ды і цяпер падобныя акцыі можна сустрэць у СМІ. Але ўсе яны разавыя і магчымыя толькі па ініцыятыве альбо з дазволу апекуна, якім з'яўляецца кіраўнік дзіцячага дома альбо іншай інтэрнатнай установы.

Пасля выпадку з друйскай дзяўчынкай Нацыянальны цэнтр усынаўлення стаў запрошваць афіцыйны дазвол у такіх апекуноў на размяшчэнне на сваім сайце (**www.child.of.by**) інфармацыі пра дзетак з асаблівасцямі развіцця.

**— Але ж Цэнтр мае рэспубліканскі банк звестак пра дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў?**

— У гэтым банку змешчана канфідэнцыяльная інфармацыя: адкуль дзеці, хто іх нарадзіў... Гэта — асабістыя карткі дзяцей. Згодна з Палажэннем пра стварэнне рэспубліканскага банка, такая інфармацыя даецца толькі тым кандыдатам ва ўсынавіцелі, якія ўжо атрымалі станоўчае заключэнне аддзела адукацыі.

**— Чаму вы вырашылі збіраць подпісы пад калектыўным зваротам?**

— Ідэя належыць не мне адной. Яна прыходзіць у галаву ўсім, хто прайшоў праз усынаўленне або прыёмнае бацькоўства. Гэтыя людзі разумеюць, што грамадству вельмі важна **ведаць** і **бачыць**, якія дзеці знаходзяцца ў дзіцячых дамах, і даць ім шанц вырасці ў сям'і.

Калектыўны зварот трэба разглядаць як прапанову, як падставу для дзеяння. Ён не змяшчае ні крытыку, ні прэтэнзіі. Нацыянальны цэнтр праводзіць вялізную і паспяховую работу па ўладкаванні дзяцей у сем'і, а таксама грунтоўную навуковую працу. За апошнія гады ўдалося павялічыць штогадовы паказчык усыноўленых дзяцей амаль да 600. Гэта вельмі добра. Але сёння 14 з паловай тысяч дзяцей у нашай краіне маюць статус для ўсынаўлення, з іх каля 6 тысяч жывуць у інтэрнатных установах! Для іх гэты паказчык не мае ніякага значэння.

**— Калектыўны зварот ініцыявалі ўсынавіцелі. Але — чаму? Гэтыя людзі ўжо сустрэлі сваё дзіця, прычым не маючы інтэрнэт-банка сірот...**

— Справа ў тым, што ўсынавіцелі лепш за астатніх ведаюць: трымаць дзяцей, асабліва малога ўзросту, у інтэрнатных установах — злачынства!

Мае малодшыя сыны да таго, як сустрэліся са мной, жылі ў вельмі добрым доме дзіцяці. Там і выхавацелі цудоўныя, і кіраўніцтва, і ўмовы. Але без сям'і ў дзіцяці не з'яўляецца прыхільнасцяў, яно не навучаецца разумець іншых людзей, выяўляць сябе... Мае дзеці выглядалі ўдвая меншымі за свой узрост. Яны дрэнна хадзілі і няўклюдна рухаліся, амаль не размаўлялі... За паўгода знаходжання ў сям'і яны выраслі на 10 сантыметраў, зрабілі настолькі моцны скачок у развіцці, што ў гэта цяжка паверыць! Сям'я — гэта сям'я. Не важна, якая: мае яна выдатныя ўмовы альбо жыве проста і сціпла...

Вядома, банк звестак — не панацэя, але ён павялічыць шанцы на ўсынаўленне тых 6 тысяч выхаванцаў дзіцячых дамоў і інтэрнатаў.

**Неяк старэйшы сын сказаў: «Мама, як людзі не разумеюць, што гэта так здорава — забраць дзіця з дзіцячага дома!»**

**— Вы лічыце, што адкрыты банк сірот змяніў бы сам прынцып падбору дзецям сям'і?**

— Калі будзе створаны адкрыты банк звестак сірот, праца па пошуку сям'і стане не толькі больш актыўнай, але ў ёй перамесціцца фокус з сямейнай пары на дзіця.

У Мінску ёсць Дом дзіцяці №1, дзе жывуць дзеці з пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы. У рэспубліканскім банку аб усынаўленні ёсць малыя адтуль, але многія патэнцыйныя ўсынавіцелі проста баяцца адкрываць папку з такімі дзеткамі, нават не глядзяць на іх. Там сапраўды ёсць дзеці з вельмі цяжкімі захворваннямі, але ёсць і такія, якія ва ўмовах сям'і цалкам або амаль цалкам папраўіліся б. Нават дзеткі з сіндромам Даўна ў сям'і развіваліся б інакш. А там шмат дзетак проста з адставаннем, з наступствамі таго, што яны не ведалі матчыных рук, голасу...

**— Вы працуеце псіхолагам у Цэнтры ўсынаўлення, падзяліцеся ўражаннямі — якія людзі прыходзяць туды?**

— Розныя. Сярэдні ўзрост — ад 30 да 45 гадоў, часцей — пары, адзінокія таксама ёсць, прычым як жанчыны, так і мужчыны. Апошніх, праўда, няшмат. Большасць усынавіцеляў сваіх дзяцей не маюць, але апошнім часам усё часцей усынаўляюць сем'і з дзецьмі. Магчыма, гэта звязана з тым, што тэма стала больш адкрытай, у грамадства з'явілася разуменне: усынаўленне — не вырашэнне праблемы бяздзетных пар, а неабходнасць тэрміновай дапамогі дзецям.

**— Як часта сустракаюцца тыя, хто хоча ўсынавіць дзіця, каб вырашыць нейкую асабістую праблему? Скажам, выратаваць шлюб, перажыць страту, пазбегнуць адзіноцтва...**

— Матыў не заўсёды бывае вызначальным. Тут вельмі важная падрыхтоўка ўсынавіцеляў. А таксама патэнцыял чалавека — што ён хоча і што можа, які ў яго характар, узаемаадносіны, асабістыя якасці і перакананні.

Нядаўна прачытала пра дзіцячы дом у Расіі, дзе жывуць дзеці-інваліды, і пра грамадскую групу, якая на працягу многіх гадоў дапамагае ім. Узначальвае групу чалавек, які першы раз туды прыехаў у якасці ўдзельніка трэнінгу асабістага росту. Іх прывезлі, каб паказаць, якія яны паспяховыя на фоне гэтых дзяцей. Вось такі быў матыў. Але калі ён туды трапіў, убачыў дзяцей, матыў змяніўся, і гэты чалавек стаў ездзіць у дзіцячы дом з зусім іншымі мэтамі.

Так і з усынаўленнем. Матыў можа быць — утрымаць мужа, а ў выніку атрымліваюцца выдатныя бацькі і цудоўная сям'я.

**— Ці патрабуе, на ваш погляд, сённяшняя працэдура ўсынаўлення нейкіх змен?**

— Я не бачу тут значных недахопаў. Пакет дакументаў лагічны, навучанне — вельмі патрэбнае. Тэрміны таксама ў большасці залежаць ад таго, як хутка ўсынавіцель пройдзе медыцынскую камісію.

Падрыхтоўка да ўсынаўлення ў нас наладжана добра, горш — з суправаджэннем сям'і пасля ўсынаўлення. Але і тут ужо ёсць напрацоўкі. Думаю, мы маем дастатковую метадычную базу для таго, каб папярэдзіць вяртанне дзяцей, калі адкрытая інтэрнэт-база звестак пра сірот усё ж такі з'явіцца.

**— Як часта ўсынавіцелі вяртаюць дзяцей і чаму?**

— Рэдка. Некалькі выпадкаў на працягу года. Бывае, вяртаюць дзіця, пражыўшы разам з ім 15-16 гадоў. Прычыны: страта кантакту, смерць або цяжкая хвароба ўсынавіцеля, распад сям'і...

Амерыканскія спецыялісты лічаць, што сярод прычын вяртання дзяцей на першым месцы стаіць нерэалізаванае чаканне ўсынавіцеля. І вінаваты ў гэтым не ўсынавіцелі, а мы, спецыялісты па апецы, якія недастаткова гэтае чаканне скарэкціравалі. Спецыялісты павінны добра вывучыць сям'ю і спрагназаваць усе рызыкі, улічыць пры гэтым асаблівасці дзіцяці: у якой сям'і яму будзе лягчэй, дзе лепш задаволяць яго патрэбы.

**— У вас ёсць і ўласны вопыт усынаўлення...**




**Інтэрнэт-праект Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі. Аўтары Калектыўнага звароту лічаць, што інтэрнэт-рэсурсы з'яўляюцца самым эфектыўным, даступным і ўніверсальным механізмам на этапе пошуку сям'і для дзяцей.**

— Прычым двойчы. Дачку я ўдачарыла 10 гадоў таму, калі мяне ніхто не рыхтаваў. І мне тады было больш складана. Цяпер вопыт і веды вельмі дапамагаюць. Я разумею, што істэрыка ў дзіцяці ў перыяд адаптацыі — гэта нармальна, што ўсе складанасці трэба спакойна прайсці, бо гэта проста пэўны — непазбежны — перыяд у новым для ўсіх жыцці.

**— У вас ужо былі дзеці?**

— Два сыны. Мы жылі побач з дзіцячым домам, я спачатку нават не ведала, думала, што гэта проста дзіцячы садок, часта гуляла там са сваімі хлопчыкамі. А потым разам з іншымі мамамі мы прыйшлі да кіраўніцтва дзіцячага дома і прапанавалі сваю дапамогу: фатаграфаваць дзетак, гуляць з імі. Нам далі групу, якую мы апякалі.

Аднойчы адбыўся выпадак, калі я зразумела, што гэтай сваёй дапамогай мы толькі шкодзім дзецям. Так, мы прыходзім, гуляем з імі, і... сыходзім. А яны застаюцца. І гэта сітуацыя ім не на карысць.

Там была дзяўчынка гадоў пяці з захворваннем, якое выклікае надзвычайную крохкасць костак, яе рукі і ногі амаль не згіналіся. Неяк мы ішлі з ёй, размаўлялі, яна трымала мяне за руку, і тут прыехаў аўтобус і нехта крыкнуў: «Госці, госці прыехалі!». Яна адразу кінула маю руку і пайшла да аўтобуса, яна спяшалася, рукі і ногі дрэнна яе слухаліся, але было відаць, як ёй важна паспець сябе... паказаць.

І тады мяне пранізала здагадка пра ўсю жудасць таго, што адбываецца. Пасля гэтага мы з мужам вырашылі, што можам адно дзіця забраць. Вырашылі ўзяць дзяўчынку, бо ўжо мелі двух хлопчыкаў, і не хацелі ствараць ім канкурэнцыю.

**— Як вы сустрэлі сваіх малодшых дзяцей?**

— Я размяшчала звесткі пра двойню на сайце НЦУ пад рубрыкай «асаблівы выпадак». Кожны раз, калі размяшчала там звесткі, думала: «Калі ніхто не ўсынавіць, то сама ўсынаўлю». Пачалі збіраць дакументы, а пакуль збіралі, тую двойню ўсынавіла іншая сям'я. Мы вырашылі — гэта лёс, і нашы — іншыя дзеці. Таксама двое. Вось так і сустрэліся.

**— Старэйшыя з разуменнем паставіліся?**

— Вядома. Два сыны ўжо студэнты, яны з задавальненнем гуляюць з малодшымі братамі, прыглядаюць за імі ў маю адсутнасць. Трохі больш складана дачцэ. Але гэта таксама нармальна, і гэта — часова.

Цяжэй зразумець людзям староннім, але і яны паступова прывыкаюць. Неяк старэйшы сын сказаў: «Мама, як людзі не разумеюць, што гэта так здорава — забраць дзіця з дзіцячага дома!»

**— Гадаванне ўсыноўленага дзіцяці адрозніваецца ад выхавання народжанага самой?**

— Трэба разумець, што ўсыноўленае дзіця мае рану, якую сям'я павінна загаіць. Сям'я не проста бярэ дзіця, каб жыць разам з ім і радавацца, яна павінна быць гаючай сям'ёй. Рана гэта, напэўна, ніколі не знікне бясследна, але бацькі павінны зрабіць усё магчымае, каб яна як мага менш балела.

**— Ці многа людзей здольныя стаць гаючай сям'ёй?**

— Думаю, усе, хто бярэ на сябе адказнасць за дзіця, здольныя інтарэсы дзіцяці паставіць вышэй за свае ўласныя, гатовы прымаць дапамогу спецыялістаў, здольныя да развіцця і змен.

**Размаўляла Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ІДЭЯ ЗАСЛУГОЎВАЕ ЎСЕБАКОВАГА І ГЛЫБОКАГА АНАЛІЗУ

**Каментарый начальніка аддзела Упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Галіны РУДЗЯНКОВАЙ**

Так, мы знаёмыя з прапановай стварыць інтэрнэт-банк дзяцей-сірот, якіх можна ўсынаўляць, і яна будзе разгледжана з удзелам розных спецыялістаў па ахове дзяцінства, у тым ліку і Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення. Папярэдняе абмеркаванне прапановы адбылося ў Міністэрстве адукацыі падчас асабістага прыёму ініцыятара гэтай ідэі.

Прапанова цікавая і прывабная, але трэба ўзважыць усе рызыкі. Я лічу, што з'яўленне інтэрнэт-банка дзяцей, якіх можна ўсынавіць, — не тое пытанне, якое патрабуе грамадскага абмеркавання.

Мы, як і ініцыятары звароту, хацелі б спадзявацца, што інтэрнэт-банк актывізуе працэс усынаўлення. Але як медыкі маюць права на выбар аптымальнага віду аперацыі, так і спецыялісты па ахове дзяцінства маюць права на выбар аптымальнага варыянту работы па сямейным уладкаванні дзяцей-сірот.

Інтэрнэт-банк — зусім не адназначны падыход да праблемы ўсынаўлення. Ёсць краіны, дзе атрыманне любой прыватнай інфармацыі пра дзяцей-сірот забаронена. Напрыклад, у Даніі ўсынавіцелі ўвогуле не маюць права выбіраць дзіця для ўсынаўлення. Там кампетэнтныя органы кіруюцца прынцыпам, што не сям'я шукае сабе дзіця, а для канкрэтнага дзіцяці падбіраюць сям'ю, якая здольная максімальна задаволіць яго асабістыя патрабаванні.

Стварэнне банка дадзеных дзяцей-сірот, пры галоўнай умове, што на кожным этапе будзе забяспечана якасная работа праекта, можа мець поспех. Аднак тут нельга кіравацца толькі эмоцыямі і энтузіязмам.

Хачу прывесці прыклад. Пры стварэнні новай сямейнай формы ўладкавання дзяцей-сірот (прыёмнай сям'і) паміж зацвярджэннем Палажэння і стварэннем першых сямей прайшоў год напружанай падрыхтоўчай работы. Праводзіліся трэнінгі для спецыялістаў, была напісана праграма падрыхтоўкі прыёмных бацькоў... Мы былі ўпэўненыя, што гэта старанная і планамерная работа забяспечыць добры вынік. Аднак не ва ўсіх выпадках атрымліваецца так, як было задумана. Не таму, што дрэннае Палажэнне альбо праграма. А таму, што адзін чалавек робіць сваю справу сумленна, а другі — абы-як.

Мы павінны ўлічыць і гэтыя рызыкі, і выпадкі адмоўнага вопыту ў суседніх краінах.

Разам з тым, хачу адзначыць: цудоўна, што інтэрнэт адыгрывае не толькі негатыўную, але і станоўчую ролю ў жыцці нашага грамадства. Вельмі добра і тое, што знайшлося так шмат неабыякавых людзей, якія не проста падпісаліся «за кампанію», але гатовы падтрымаць праект сваім удзелам.

І яшчэ раз паўтару: ідэя заслугоўвае ўсебаковага і глыбокага аналізу.

■ Беларусы і свет

# КУРС НА ЗБЛІЖЭННЕ

## Адносіны Беларусі і Таджыкістана актывізуюцца

**Праз 20 гадоў незалежнасці цікава прасочваць лёс і ўзаемныя стасункі краін, якія некалі былі адной дзяржавай. Пра суседзяў мы, натуральна, заўжды больш дасведчаныя. А сёння забяромся трохі далей — у сонечны Таджыкістан. З размовы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом гэтай дзяржавы Казідаўлатам КАІМДОДАВЫМ высвятляем, што замінае Таджыкістану на шляху ў Еўразійскі саюз, якую ролю можа адыграць краіна ў выхадзе беларускай прадукцыі на цэнтральнаазіяцкі рэгіён, калі адбудзецца візіт прэзідэнта Эмамалі Рахмона ў Беларусь.**



**— Казідаўлат Каімдодавіч, апошнім часам слова «інтэграцыя» ўсё часцей гучыць у дачыненні да постсавецкіх краін. Як глядзіць Таджыкістан на тое, каб самому далучыцца да будучага Еўразійскага саюза?**

— Дзяржавы ў сучасным свеце не могуць жыць у адзіночку. Мы падтрымліваем інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы. Нейкія аспекты ў нас гарманізаваны так, што хоць сёння далучайся да АЭП. Але ёсць і складанасці — адсутнасць агульнай мяжы, напрыклад. Яна магла б вырашыцца, калі б да інтэграцыйнага ўтварэння далучыўся спачатку хаця б наш сусед Кыргызстан. Аднак ён ужо ўступіў у Сусветную гандлёвую арганізацыю, а мы там пакуль толькі назіральнікі. Узнікнуць свае нюансы. І калі нам давядзецца адмаўляцца ад сваіх прыбыткаў дзеля выканання ўмоў інтэграцыі, нашто нам такі рух? Мы не можам кідацца кудысьці, дзе нас можа чакаць бездань, — трэба ўсё ўзважыць. Павінны быць узаемная выгада, агульны інтарэс. Таму мы пакуль вывучаем такую магчымасць і распрацоўваем механізмы для ўступлення.

**— А пакуль Беларусь, відаць, становіцца больш прывабным гандлёвым партнёрам?**

— Безумоўна, функцыянаванне АЭП і намер трох дзяржаў стварыць Еўразійскі саюз дае дадатковы імпульс развіццю нашага супрацоўніцтва. За апошні год тавараразварот павялічыўся амаль у чатыры разы і склаў больш за 70 млн доляраў, з дадатным сальда для Беларусі, дарэчы. Пастаўляюцца найперш трактары для сельскай гаспадаркі, вялікагрузная і кар'ерная тэхніка для будаўніцтва гідраэнергетычных аб'ектаў і выкарыстання ў гарнарудная прамысловасці. За апошнія два гады ў Таджыкістане з'явілася больш за сотню адзінак будаўнічай і кар'ернай тэхнікі беларускай вытворчасці. Але патэнцыял выкарыстоўваецца не ў поўнай меры, неабходна нарошчваць аб'ёмы паставак. Таджыкістан павінен стаць пляцоўкай для выхаду Беларусі на рынак Цэнтральнай Азіі. Беларуская тэхніка можа вырабляцца сумеснымі сіламі ў Таджыкістане. Яе прасцей вырабляць там, чым гнаць на такую адлегласць. І ўжо гэтай сумеснай прадукцыяй мы маглі б гандляваць з тэрыторыі Таджыкістана на паўднёвых рынках. У актыўнай стадыі перамовы пра зборачную вытворчасць трактароў і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі, а таксама дарожна-будаўнічай і камунальнай тэхнікі.

**— У якіх яшчэ галінах краіны маглі б скааперавацца?**

— Натуральна, у аграрным сектары. У Таджыкістане спрыяльныя кліматычныя ўмовы, шмат сонечных дзён, што дазваляе за год атрымліваць два—тры ўраджаі. Мы павінны наладжваць новую форму кааперацыі. У насеннядоўстве прапануем такую формулу. Бяром, скажам, кілаграм беларускага насення, у сябе робім з яго тону, пэўную частку зноў пастаўляем у Беларусь. Абедзве краіны ў выйгрышы. Перспектыўным лічыцца таксама развядзенне племяннай буйной рагатай жывёлы.

**— Ці заглядваецца Таджыкістан на беларускія прадпрыемствы, выстаўленыя на прыватызацыю?**

— Так, таджыкскія спецыялісты зацікаўлены ўдзельнічаць у прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў. Як вытворцы бавоўны, мы хацелі б акцыянаваць беларускае прадпрыемства па вытворчасці пражы — у прыватнасці, Баранавіцкае баваўнянае аб'яднанне. Нас цікавіць менавіта вытворчасць канечнага прадукту з нашай сыравіны ў еўрапейскай краіне. Гэта магло б стаць паспяховым праектам.

**— Якія таджыкскія прадукты вы хацелі б бачыць у Беларусі, а беларускія — у сваёй краіне?**

— Калі мы вырашым пытанні з нашымі авіятарамі, то маглі б наладзіць пастаўкі сюды грузавымі самалётамі свежай садавіны, агародніны і сухафруктаў. Мы славімся сваімі запасамі вады. І мінеральныя, і пітныя воды, я ўпэўнены, прыйшліся б даспадобы беларускім спажыўцам. Таджыкскі мёд здабываецца высока ў гарах — гэта надае яму непаўторны смак і водар. Не адным пакаленнем праверяны гаючыя ўласцівасці нашых лекавых траў. Нашым спецыялістам у фармацэўтыцы варта сумесна папрацаваць і... заваліць беларускія і таджыкскія аптэкі такой прадукцыяй! Прапрацоўваюцца магчымасці павелічэння паставак з Таджыкістана ў Беларусь баваўнянага валакна, воўны, гарбарнай сыравіны, перапрацаванай садавіны і агародніны.

Таджыкскі рынак сёння заваяваны пакістанскай бульбай — непарадак! Павінна быць беларуская! Мы зацікаўлены таксама ў пастаўках мукі, сухога малака з Беларусі. А калі наладзіць авіязносіны — то і сметанковага масла, сыроў. Беларускія сыры па смакавых уласцівасцях нічым не саступаюць якасным еўрапейскім. Я ўвогуле лічу, што рынак на прасторы СНД павінен быць запоўнены таварамі вытворчасці гэтых краін. Многія заходнія прадукты, на жаль, не такія натуральныя, як нашы, утрымліваюць больш хіміі. Тамтэйшыя фермеры клапоцяцца найперш пра ўраджайнасць і прыбыткі, а наша сельская гаспадарка яшчэ не развучылася вырабляць смачныя прадукты.

**— Студэнты беларускіх ВНУ ўсё часцей дзеляць парту з таджыкскімі аднагодкамі...**

— Мы і надалей будзем павялічваць колькасць студэнтаў, якія навучаюцца ў Беларусі. Ужо адкрыты факультэт БНТУ ў Таджыкскім тэхнічным універсітэце. Мы арыентаваныя не толькі на падрыхтоўку, але яшчэ і на павышэнне кваліфікацыі нашых спецыялістаў у Беларусі. Рыхтуем таксама пагадненне паміж Акадэміямі навук.

**— Як рухаецца праект будаўніцтва Рагунскай ГЭС, у адрас якой гучыць столькі крытыкі? Праясніце, калі ласка, сітуацыю.**

— Мы восьмыя ў свеце па запасах водных рэсурсаў. Пры гэтым выкарыстоўваем менш за пяць адсоткаў. Нам жыццёва неабходна будаваць гідраэлектрастанцыю. Мы гэта не ўчора прыдумалі: 40% збудавання было ўзведзена яшчэ да распаду СССР. Калі дабудуем, забяспечым таннай электраэнергіяй не толькі сваю краіну — увесь рэгіён. Да таго ж яна яшчэ ўзнаўляльная і экалагічна чыстая. Туркменістану, Узбекістану гэта таксама выгадна: яны будуць менш спальваць газ для вытворчасці і больш яго прадаваць. У нашай энергіі зацікаўлены Пакістан, Афганістан, Індыя — рынак ёсць. Праекціроўшчыкі заяўляюць пра бяспеку плаціны — у прыватнасці, яе сейсмаўстойлівасць. Суседнія краіны непакояцца, што пры будаўніцтве вадасховішча знізяцца аб'ёмы стоку ў нізоўях Амудар'і і зменяцца рэжымы водаразмеркавання. Такія сцвярджэнні не адпавядаюць рэчаіснасці. У адпаведнасці з праектам, Рагунскае вадасховішча будзе напаўняцца на працягу 13 — 18 гадоў і пройдзе амаль непрыкметна для арашальнага земляробства. Уплыў запаўнення вадасховішча на сток Амудар'і складзе не больш за 3 — 5 адсоткаў. Само вадасховішча плануецца выкарыстоўваць як у энергетычных, так і ў ірыгацыйных мэтах. Мы прапаноўвалі суседзям, датычным да водных крыніц, стварыць сумесны водна-энергетычны кансорцыум. Наша ініцыятыва не была падтрымана. Магчыма, яны асцерагаюцца таго, што мы будзем дыктаваць цэны на ваду. У нас такіх планаў няма. У такой сітуацыі патрэбны толькі добры палітычны падыход, дыпламатыя, бо гэта ў інтарэсах усіх. Народы рэгіёна будуць жыць лепш, таму мы павінны ўсе гэтыя бар'еры і непаразуменні зняць. Беларускі Прэзідэнт падчас візіту ў Таджыкістан, дарэчы, выказаў падтрымку ініцыятыве будаўніцтва Рогунскай ГЭС.

**— Пасля леташняга візіту беларускага лідара ў Таджыкістан адносіны прыкметна актывізаваліся. Калі плануецца візіт у адказ?**

— Так, найбольш адчувальныя зрухі — у прамысловасці, энергетыцы, сельскай гаспадарцы. Візіт таджыкскага прэзідэнта Эмамалі Рахмона ў Беларусь не за гарамі. Дзякуй Богу, у нас няма палітычнага рознагалосся. Нашы краіны падтрымліваюць адна адну на ўсіх міжнародных пляцоўках. Паміж нашымі прэзідэнтамі прыязныя сяброўскія адносіны. Іх аб'ядноўвае тое, што абодва яны — сапраўдныя лідары, выхадцы з народа. Яны занялі свае пазіцыі не праз усплёскі і народныя хваляванні. Гэта тое, што прывязвае іх да народа, зямлі.

**— Што б вам, як дыпламату, хацелася дадаць у адносіны краін?**

— Самая галоўная задача дыпламата — стварыць добрыя ўмовы для развіцця стасункаў, прыбраць бар'еры, якія замінаюць людзям. Я рад, што паміж нашымі краінамі няма візавага рэжыму, гэта вялікая справа. У нас нават з некаторымі суседзямі ёсць візавы рэжым, а з Беларуссю, якая знаходзіцца ў Еўропе, няма. У той жа час нам трэба пашырыць прававую базу, якая забяспечвала б свабодны рух капіталу, тавараў. Актывізаваць супрацоўніцтва сярэдняга прадпрымальніцтва. Яно павінна быць касцяком развіцця грамадства. Мы ўсё яшчэ маем праблемы з лагістыкай. Адсутнасць прамога рэйсу змушае нас дабірацца праз Прыбалтыку. А гэта перашкаджае бізнэс- і турпаездкам.

**— Чым мы маглі б прывабіць вандроўнікаў?**

— У Таджыкістан турыста вабяць горы і цудоўны клімат. Трэба арганізаваць паездкі беларускіх дзяцей туды. Каб яны не толькі частаваліся таджыкскай садавінай дома, але маглі паехаць і наесціся вітамінаў там. А ў Беларусь госця вабіць магчымасць аздараўлення ў мясцовых санаторыях. Сам люблю прагульвацца па ваколіцы: месцы тут дзівосныя. Вунь расіяне ўжо даўно зарыентаваліся. Неяк звярталіся да мяне землякі, якія збіраліся ў Беларусь на адпачынак. Тэлефаную галоўнаму ўрачу аднаго з санаторыяў: няма, кажа, месцаў, пасол, — на месяцы наперад усё распісана! Так што Беларусь, можна сказаць, санаторная «мека».

**— Нядаўна была ўтворана беларуска-таджыкская суполка сяброўства і культурных сувязяў. Яна напэўна змацуе повязі дзвюх краін.**

— Так, гэта адкрые новую старонку ў двухбаковых адносінах. Самае галоўнае — гэта ўсё ж стасункі паміж людзьмі. Жыхары Таджыкістана ведаюць Беларусь як краіну, дзе жывуць працалюбівыя, шчырыя, вельмі прыстойныя, з шырокай душой людзі, якія любяць сваю радзіму, шануюць памяць загінулых вызваліцеляў, клапатліва ставяцца да традыцый, даражаць агульначалавечымі каштоўнасцямі, працуюць і ствараюць на карысць краіны. Беларусам уласцівыя дабрыня, вытрымка, цярпенне і непахіснасць. Краіну вылучаюць сярод іншых паступальныя рух і развіццё пасля распаду СССР. Была ўтрымана эканоміка, яна застаецца кіруемай. Не была дапушчана хаатычная прыватызацыя, не была разбазарана дзяржаўная маёмасць ва ўсіх сферах. Адбываецца сістэмная мэтанакіраваная прыватызацыя дзеля народа. Захаваны важныя прадпрыемствы, аб'екты. А для рэканструкцыі заўжды трэба менш сродкаў, чым для адбудоўвання нанова. Я ўдзячны лёсу за добразычлівасць — у Беларусі працуецца спакойна і плённа.

**Ала МАЧАЛАВА. Фота аўтара**

■

■ Прэм'ера

# НЕВЫНОСНАЯ МАНАТОННАСЦЬ БЫЦЦЯ

## Купалаўскі тэатр разважае, ці ёсць жыццё ў балоце?

**Дзіця памірала... Яго маці ў роспачы імкнулася дастукацца да сямейнікаў, якія ў гэты момант рупіліся толькі пра тое, як зямлю апрацаваць, каб дабро не прапала. «Народзіш яшчэ», — сказаў Яўхім... Не дзіва, што Ганна захоча вырвацца з наканаванасці нетаропкага існавання, якое засмоктвае, як балота, цягне ўніз, не дазваляючы надзеі на змены, і нават яе Васіль кажа: «Ето не так просто...» «Палескія хронікі» Івана Мележа вярнуліся ў Купалаўскі тэатр у XXI стагоддзі разам з развагамі пра «беларускую мару» — сваю зямлю і сваю волю.**



Фота БЕЛТА

Асэнсаваць «Людзі на балоце» Івана Мележа ўзяўся Аляксандр Гарцуеў. Падаецца, узяўся не толькі таму, што была нагода ўзгадаць пра Мележа ў сувязі з 90-годдзем, якое адзначалася летась. Напэўна прыцягнула сама тэма: людзі і балота. І хоць сам Мележ апісаў падзеі амаль 100-гадовай даўніны, падаецца, што для беларусаў гэтая тэма — вечная. І ўсё яшчэ сучасная. Вырашыць, дзе тут першаснае, а дзе другаснае, для нас усё адно, што адказаць на асноўнае пытанне філасофіі: што першаснае — матэрыя ці свядомасць? Балота — гэта матэрыя ці субстанцыя, якая ў нейкім сэнсе вызначае свядомасць людзей. Людзі тэарэтычна могуць паўплываць на матэрыю, імкнучыся пазбавіцца ад балотаў ці вырвацца з іх. Але «ето не так просто...»

Няўдзячная гэта справа — пераносіць на тэатральную сцэну эпічны твор. Вядома, што тэатральнымі сродкамі складана перадаць асаблівую атмасферу палескай вёскі, смак беларускага жыцця, які адчуваеш праз словы пісьменніка. І калі перадаць вясковы побыт на сцэне рэальна, то як даць адчуванне рамантыкі сенакосу? Сцэнічнае афармленне Ігара Анісенкі даволі простае, але ўдала працуе на ідэю. Таксама, як і народныя песні ды музычнае афармленне Ігара Фрыгі. Але складана пераносіць падобныя творы на сцэну яшчэ і таму, што героі Мележа — палешукі — нешматслоўныя людзі. Таму больш за ўсё хвалявала менавіта гэта: што з апісаных у раманах падзей здолее адлюстраваць пастаноўка?

Рэжысёр узяў за аснову галоўную лінію: каханне Ганны (актрысы Вікторыя Чаўлытка і Валянціна Гарцуева) і Васіля (Раман Падаляка і Аляксандр Паўлаў). Праўда, на сцэне яно ператварылася ў сапраўдны брутальны трохкутнік: Яўхімка (акцёры Павел Харланчук і Арцём Барoдзіч) перарваў манатоннасць існавання і кахання галоўных герояў, дадаўшы спектаклю «драйву», дзе хапае гвалту і мардабою. Але манатоннасць вясковага жыцця нават падчас вяселля адчуваецца. І нават у песнях, якія спяваюць на вяселлі, — туга і безнадзейнасць. «Няўжо ўсё сапраўды так дрэнна?» — так і хочацца спытаць. Але ж насамрэч, калі глядзіш далей, то разумееш: ёсць падстава для аптымізму. Яе стварае Ганна, якая хоча адстаяць сваё права на шчасце. Але мы ўжо разумеем, што «ето не так просто...»

Гэта толькі здаецца, што мы загадзя ведаем, як павінна ўсё скончыцца: усе ж чыталі кніжку ў школе... Вось гэта і ёсць, можа, адна з галоўных прычын, чаму творы са школьных падручнікаў па літаратуры трэба нагадваць людзям цягам жыцця. Бо бывае так, што да вельмі важных кніжак мы ў дзяцінстве яшчэ не даспелі, таму не можам адэкватна іх успрымаць. А потым наўрад ці будзем звяртацца зноў: праходзілі ж па літаратуры. Але нават для тых, хто беларускую літаратуру ведае на «выдатна», бываюць адкрыцці ў быццам бы вядомых творах, якія звязаны з іх сучасным успрыманнем. Адкрыць нанова «Людзі на балоце» — гэта ўсё адно што паглядзець у люстэрка. Люстэрка, у якім адбіваецца беларускае жыццё і самі беларусы. Што тады, што цяпер.

